Редакционная коллегия:

**Канапацкая З.И.**, кандидат исторических наук (ответственный редактор).
**Гайнетдинов Р.Б.**, кандидат исторических наук.
**Филатова Е.Н.**, кандидат исторических наук.
**Шкутько Л.Л.**, кандидат исторических наук.

Рецензенты:

**Лютый А.М.**, доктор исторических наук.
**Космач Г.А.**, доктор исторических наук.

**Канапацкая З.И.** (отв.ред.)
Народы СССР в годы Великой Отечественной войны 1941-1945 гг. (к 60-летию Победы советского народа в Великой Отечественной войне). Материалы XI-й Международной научно-практической конференции. Минск, 30-31 мая 2005 г. Мн.: 2006. – 380 с.

Сборник научных статей посвящён участию народов СССР в Великой Отечественной войне, содружеству советского народа в партизанском движении на территории Беларуси, в боевых операциях по освобождению Беларуси от немецко-фашистских захватчиков. Рассчитан на широкий круг читателей.

Материалы изданы при поддержке Комитета по делам религии при Совете Министров Республики Беларусь.

© Канапацкая З.И., 2006.

Набор и вёрстка Чимбаевич Д.Х.

**Комитет по делам религий и национальностей при Совете Министров Республики Беларусь**

**Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка**

**Всемирный конгресс татар**

**Белорусское общественное объединение татар "Зикр уль-Китаб"**

**Международный фонд развития татаро-башкирского духовного наследия «Чишма»**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# НАРОДЫ СССР В ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ 1941-1945 гг.

## К 60-летию Победы советского народа в Великой Отечественной войне

## Материалы XI Международной научно-практической конференции

**Минск**
**2006**

# ДАПАМОГА ПАРТЫЗАН МАГІЛЕЎШЧЫНЫ ВОЙСКАМ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ Ў ВЫЗВАЛЕННІ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ (ВЕРАСЕНЬ 1943 – ЛІПЕНЬ 1944 ГГ.)

А. Рацько

У канцы жніўня 1943 г. Чырвоная Армія перайшла ў наступленне ад Вялікіх Лук да Чорнага мора. Войскі Бранскага фронту прарвалі добра ўмацаваную абарону ворага, вызвалілі Бранск і выйшлі на рубеж р. Сож і Проня. Пачалося вызваленне Беларусі, у тым ліку і Магілеўскай вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Яшчэ вясною 1943 г. для аператыўнага кіравання партызанскім рухам на тэрыторыі вобласці была ўтворана ваенна-аператыўная група (ВАГ) пры Магілёўскім падпольным абкаме КП(б)Б. Адначасова было створана Магілеўскае партызанскае злучэнне, якое таксама называлася Магілеўская ВАГ. У яго ўвайшлі партызанскія брыгады і атрады, што дзейнічалі на тэрыторыі вобласці. Пры падпольных райкамах партыі таксама дзейнічалі ваенна-аператыўныя групы. Імклівы рост народнага супраціўлення веў да павялічэння колькасці партызанскіх атрадаў, некаторыя з якіх разгортваліся ў партызанскія палкі. К восені 1943 г. у Магілеўскім партызанскім злучэнні было 33,4 тыс. партызан [1, 13].

З вызваленнем першых раёнаў БССР адбываецца працэс болей шчыльнага ўзаемадзеяння партызанскіх фарміраванняў з Чырвонай Арміяй. Гэтаму спрыяў размах партызанскага руху, накоплены баявы вопыт барацьбы з захопнікамі, налажванне ўстойлівай радыё і авіясувязі партызан з камандваннем франтоў, наступаючых у напрамку Беларусі.

Для арганізацыі ўзаемадзеяння партызан з войскамі Чырвонай Арміі бюро ЦК КП(б)Б прыняў спецыяльную пастанову, у якой гаварылася: “Дзеля каардынацыі дзеянняў



беларускіх партызан з дзеяннямі войскаў Бранскага фронту, дзеля поўнага выкарыстання камандаваннем фронту перадаваемых партызанамі разведдадзеных, а таксама дзеля пастаноўкі задач партызанскім брыгадам і атрадам у інтарэсах надыходзячых часцей Чырвонай Арміі – утварыць пры ваенным савеце Бранскага фронту аператыўную групу Беларускага штабу партызанскага руху (БШПР) з выдзяленнем у яе распараджэнне 16 радыёстанцый з радзістамі” [2, 1]. Задача аператыўнай групы заключалася ў тым, каб аказаць партызанам дапамогу зброяй і боепрыпасамі, каардынаваць іх дзеянні з дзеяннямі войскаў Чырвонай Арміі.

13-14 верасня 1943 г. у Магілёўскім падпольным абкаме КП(б)Б адбылася нарада сакратароў падпольных райкамаў партыі і камсамола, камандзіраў, камісараў і сакратароў партыйных арганізацый партызанскіх брыгад, палкоў і атрадаў вобласці, на якім прысутнічала 146 чалавек. На ім былі разгледжаны задачы партызан у сувязі з наступленнем войскаў Чырвонай Арміі [3, 59].

Першымі на тэрыторыю Магілёўскай вобласці ў верасні 1943 г. уступілі армейскія падраздзяленні 50-й арміі (камандуючы генерал-лейтэнант І.В. Болдзін), з якімі пачалося шчыльнае ўзаемадзеянне партызан Магілёўшчыны.

24 верасня 1943 г. 13-я Касцюковічская брыгада (камандзір С.А. Мазур) захапіла дарогу Забычанне-Норкіна-Краснаполле, па якой адступалі варожыя часткі. У баі каля вёскі Брацькавічы была знішчана значная колькасць гітлераўцаў. Партызаны праявілі ўзор мужнасці і адвагі. Асабліва вызначыліся байцы і камандзіры 1-га батальёна пад камандаваннем І.І. Дарыенка. Узаемадзеючы з 324-й стралковай дывізіяй 50-й арміі, партызаны замініравалі і зрабілі завалы на ўсіх дарогах, тым самым парушылі планамернае адступленне войскаў ворага. За аказаную дапамогу 50-й армії генерал І.В. Болдзін аб’явіў камандаванню і ўсяму асабоваму складу брыгады падзяку [4, 7; 31].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1 кастрычніка 1943 г. 42-і партызанскі атрад (камандзір Г.А. Каралёў) зрабіў засаду на дарозе Краснаполле-Прапойск, па якой адступалі фашысты. Не падазруючы аб наяўнасці тут партызан, гітлераўцы сталі разгортвацца к бою супраць наступаючых часцей 50-й арміі. У гэты момант партызаны адкрылі шчыльны агонь па ворагу. Акупанты былі ў паніцы. Падаспеўшыя воіны Чырвонай Арміі і партызаны пайшлі ў атаку. Немцы быў разбіты ўшчэнт. Толькі забітымі яны згубілі каля 900 салдат і афіцэраў [5, 44].

Партызанскі атрад №41 пад камандаваннем С.П. Карзюкова арганізаваў сустрэчны бой за ракой Сож на дарозе Краснаполле-Слаўгарад. У выніку быў знішчаны 81 гітлеравец. На чыгунцы Крычаў-Чаўсы партызаны ўчынілі 5 дыверсій па падрыву варожых эшалонаў. У той жа час паспяхова ўзаемадзейнічалі з перадавымі часткамі 50-й арміі партызанскія атрады пад камандаваннем І.В. Кананыхіна, М.І. Скандзілава, М.А. Нарчука і іншых [6 ].

Разгортваючы наступленне на магілёўскім напрамку, часткі Чырвонай Арміі ва ўзаемадзеянні з партызанамі вызвалілі з 26 верасня па 2 кастрычніка 8 усходніх раёнаў вобласці з цэнтрамі Хоцімск, Клімовічы, Касцюковічы, Мсціслаўль, Чэрыкаў, Крычаў, Краснаполле і Дрыбін [7, 113].

5 кастрычніка 1943 г. у данясенні ў БШПР сакратар Магілёўскага падпольнага абкама КП(б)Б Д.С. Маўчанскі паведамляў, што партызаны Магілёўскай вобласці гатовыя авалодаць заходнім берагам р. Днепр паўночней Магілёва і на поўдзень, у раёне Дашкоўка, і забяспечыць фарсіраванне р. Днепр часткамі Чырвонай Арміі, а таксама, калі будзе пастаўлена задача, авалодаць Магілёвам [8, 26].

У хуткім часе быў распрацаваны план узаемадзеяння партызан Магілеўскага партызанскага злучэння з войскамі 50-й арміі па разгрому групоўкі ворага на заходнім беразе р. Днепр. на ўчастку Дашкаўка-Баркалабава ў перыяд з 13 па 20 кастрычніка 1943 г. Аперацыя была распрацавана штабам 50-й арміі сумесна з БШПР. Галоўная мэта аперацыі зводзілася



да таго, каб дзеяннямі партызанскіх сіл Клічаўскай партызанскай зоны садзейнічаць войскам 50-й арміі ў захопе плацдарму на заходнім беразе Дняпра. На падставе распрацаванага плана аперацыі ВАГ Магілёўскага падпольнага абкама партыі 15 кастрычніка 1943 г. выдала загад атрадам Клічаўскага, Быхаўскага, Кіраўскага і Шклоўскага раёнаў аб аказанні ўсямернай дапамогі наступаючым часцям Чырвонай Арміі ў забеспячэнні фарсіравання Дняпра на ўчастку Новы Быхаў-Тайманава-Баркалабава-Стайкі. Партызанскім атрадам ставіліся канкрэтныя задачы: Кіраўскай ВАГ захапіць пераправу на заходнім беразе Дняпра і весці разведку ў напрамку Палянавічы-Бахань; Быхаўскай ВАГ весці разведку ў напрамку Журавічы-Вялікая Зімніца; Клічаўская ВАГ – у напрамку Сялец-Халапееў. Партызанскім атрадам указваліся канкрэтныя маршруты руху да Дняпра, раёны захопу і ўтрымання пераправаў, накірункі вядзення разведкі. 208-му партызанскаму палку імя Сталіна (камандзір Е.Н. Беспаясаў) ставілася канкрэтная задача блакіраваць усе шляхі падыходу з боку Магілёва, арганізаваць заслоны з мэтай прадухілення флангавых удараў ворага, выводу са строю чыгуначнай лініі Дашкоўка-Магілёў і шашы Княжыцы-Магілёў [9 452].

Але, у сувязі з тым, што фронт стабілізаваўся, дасканала распрацаваная аперацыя праведзена не была. Партызаны атрымалі новую задачу: разгарнуць баявыя дзеянні ў тыле ворага, зрываць яго перавозкі па чыгунках і грунтовым дарогам, знішчаць склады, артылерыйскія пазіцыі, перашкаджаць абараняльным працам, весці разведку.

Новы, 1944 г. партызаны адзначылі яшчэ больш моцнымі ўдарамі па чыгуначным камунікацыям нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Нягледзячы на асобыя меры акупантаў па ахове чыгуначных магістраляў, народныя мсціўцы праводзілі ўсё новыя і новыя аперацыі па падрыву рэек, мастоў і эшалонаў ворага. Толькі на ўчастках чыгуначных ліній Орша-Магілёў і Бабруйск-Асіпавічы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

партызаны ў студзені 1944 г. правялі 233 аперацыі па падрыву варожых ваенных эшалонаў [10, 104].

Партызаны Асіпавічскага злучэння за люты 1944 г. пусцілі пад атхон 46 варожых эшалонаў, агнём з супрацьтанкавай зброі падбілі 18 паравозаў, узарвалі і спалілі 11 мастоў на чыгунках і шасейных дарогах, перарэзалі 8,5 км. тэлефонна-тэлеграфнай сувязі [11, 115].

У сакавіку 1944 г. партызаны Магілёўскай вобласці ажыццявілі 109 крушэнняў цягнікоў на лініях Мінск-Орша, Мінск-Бабруйск і Орша-Магілёў, знішчыўшы пры гэтым 87 паравозаў, 420 вагонаў і 139 платформ з рознымі грузамі, 37 цыстэрнаў паліва [12, 162].

Яшчэ больш значнымі былі поспехі партызан летам 1944 года. напярэдадні Беларускай наступальнай аперацыі "Багратыён". У ноч на 20 чэрвеня 1944 г. пачаўся трэці этап "рэйкавай вайны". Партызаны Магілёўскай вобласці прынялі самы актыўны ўдзел у гэтай аперацыі. Так, атрады Шклоўскай ВАГ атрымалі заданне правесці баявую аперацыю на чыгунцы Масква-Мінск на перагоне Слаўнае-Трацылава. У выніку было ўзорвана 1500 чыгуначных рэяк, пашкоджана 2300 м. сувязі, забіта больш за 20 гітлераўцаў. Аналагічныя аперацыі правялі Бярэзінская, Бялынічская і іншыя ВАГ вобласці [13,506].

Асабліва моцны ўдар нанеслі партызаны на чыгунцы Орша-Магілёў. Захапіўшы з баямі дарогу, яны парушылі 40 км. чыгуначнага палатна, узарвалі каля 5000 рэек і 2 чыгуначных маста. Разбурэнне чыгункі было такім вялікім, што акупанты не змаглі яе аднавіць да 26 чэрвеня 1944 г. – моманту заняцця яе часцямі Чырвонай Арміі. На перагонах разбуранай чыгункі засталіся больш за 10 эшалонаў, якія фашысты не здолелі адправіць [14, 522].

Сваімі дзеяннямі на камунікацыях партызаны адыгралі важную ролю ў дэзарганізацыі працы чыгуначнага транспарту ворага ў час напружаных баёў на франтах Вялікай Айчыннай вайны.



Працягваліся аперацыі партызан на шасейных і грунтавых дарогах. 19 студзеня 1944 г. камандаванню атрада №60 імя Ф.М. Сядлецкага паступіла паведамленне аб тым, што карны атрад гітлераўцаў колькасцю 60 чалавек рухаецца па дарозе Шклоў-Круглае на вёскі Чорнае і Чарнаруча. Нечаканым ударам з засады каля вёскі Аляксандраўка партызаны разбілі калону ворага, знішчыўшы пры гэтым 28 чалавек, захапілі вялікія трафеі [15, 44].

Толькі за сакавік 1944 г. партызаны ў ходзе налётаў на шашу Магілёў-Бабруйск і Магілёў-Мінск узарвалі 8 мастоў, пашкодзілі 12 км праезднай часткі, каля 40 км тэлефонна-тэлеграфнай сувязі. У красавіку партызанскія атрады знішчылі на шасейных і грунтавых дарогах 143 аўтамашыны, а ў маі – 222, 19 танкаў, 2 бронемашыны, 43 павозкі, некалькі сотень салдат [16, 105-106.].

У закліку Магілёўскага абкама КП(б)Б да партызан вобласці ад 28 чэрвеня 1944 г. гаварылася: «Таварышы партызаны і партызанкі, камандзіры і палітработнікі! Па аднаму і разам з часцямі Чырвонай Арміі біце на кожным кроку бягучага ў паніцы ворага, не давайце яму перабрацца праз раку Беразіну!»

У ноч на 29 чэрвеня 1944 г. партызаны Бярэзінскай ваенна-аператыўнай групы ў складзе 120-й брыгады і 130-й брыгады "Месть", а таксама асобна дзейнічаючых атрадаў 140-га і 346-га колькасцю звыш 1500 чалавек на чале з камандзірам Т.К. Круком нанеслі ўдар па адыходзячым гітлераўскім войскам на шашы Магілёў-Мінск у раёне вёскі Валы, знішчыўшы пры гэтым вялікую колькасць гітлераўскіх салдат, афіцэраў і ваеннай тэхнікі. 1 ліпеня ў раёне вёскі Галынка яны разбілі на дарозе Дулебы-Мяжонка да дзвух рот фашысцкіх салдат і ўтрымлівалі дарогу на працягу чатырох гадзін, да падходу частак Чырвонай Арміі.

Аналагічныя аперацыі ажыццяўлялі партызаны Бялынічскага, Круглянскага і Асіпавічскага раёнаў. Асіпавічскія партызаны ў баях на шляхах адыходу ворага

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

знішчылі 1322 і ўзялі ў палон 2412 гітлераўскіх салдат і афіцэраў. У цэлым жа партызаны, узаемадзейнічаючы з надыходзячымі войскамі Чырвонай Арміі, толькі ў перыяд выгнання гітлераўцаў з тэрыторыі вобласці, знішчылі больш за 2000 і ўзялі ў палон да 4000 фашысцкіх салдат і афіцэраў [17, 300-301]. (Всенародная борьба в Белоруссии, Т.3., С. 300-301.).

### Літаратура


1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 5. Мн., 1999.
2. НА РБ, ф.17, воп. 43, спр.198.
3. Там жа, ф. 4159, воп. 1, спр. 3, арк. 59.
4. Там жа, ф. 3500, воп. 4, спр. 104.
5. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. В 3-х томах. Мн., 1983-1985. Т. 3. Мн., 1985.
6. НА РБ, ф. 3500, воп. 4, спр. 109, арк. 1; спр. 122, арк. 21-22.
7. Непокорённая Белоруссия: Воспоминания и статьи о всенародном партизанском движении в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941-1945 гг.). М., 1963.
8. НА РБ, ф. 3500, воп. 4, спр. 8.
9. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941-1945 г./ А.А. Коваленя, А.М. Литвин и др. Мн., 2005:
10. Всенародная борьба в Белоруссии... . Т.3.
11. Непокорённая Белоруссия... .
12. НА РБ, ф.3500, воп. 4, спр. 90.
13. Там жа, спр. 88.
14. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): Документы и материалы. В 3-х томах. Мн., 1967-1982. Т.3.
15. НА РБ, ф.3500, воп. 4, спр. 87.
16. Всенародная борьба в Белоруссии... . Т.3.
17. Там жа. С. 300-301.




## СПРОБА СТВАРЭННЯ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА КАСЦЁЛУ ПАД ЧАС НЯМЕЦКАЙ АКУПАЦЫІ (1941 – 1944гг.)

**В. Іванова**

Адным з найбольш складаных і малавядомых перыядаў у дзейнасці каталіцкага касцёлу на Беларусі былі гады Вялікай Айчыннай вайны.

Гітлераўская акупацыя была ўспрынята пэўнай часткай нацыянальнай інтэлегенцыі як гістарычны шанец рэалізацыі сваіх планаў па адраджэнню беларускай дзяржаўнасці, таму беларускія дзеячы праявілі гатоўнасць да супрацоўніцтва з акупацыйнымі ўладамі. Не апошняя роля ў рэалізацыіі гэтых планаў адводзілася рэлігіі, і, у прыватнасці, касцёлу, бо праблемы рэлігійныя цесна звязваліся з нацыянальнымі і палітычнымі. Нямецкія дакументы, складаючыя прававую базу дзейнасці розных канфесій, насілі супярэчлівы характар. Абвяшчаючы свабоду веравызнання і дзейнасці ўсіх канфесій, яны дадаваліся сакрэтнымі распараджэннямі, якія абмяжоўвалі сферу ўплыву касцёлу.

Аналіз нямецкіх дакументаў тых гадоў, дае магчымасць зрабіць выснову аб насцярожаных і недаверлівых адносінах да палякаў з боку вайскоўцаў вермахту. Па сваёй варожасці іх параўноўвалі толькі з яўрэямі. Адзначалася, што большасць з іх спрытней, чым беларусы, і многія разумеюць нямецкую мову, і таму небяспечнасць завялікая. Калі ў раёнах, дзе палякі пераважаюць, і далей будзе працягвацца прыгнятанне імі беларусаў, калі яны паспрабуюць паклёпнічаць на беларусаў фальшывымі данашэннямі ў нямецкія часці і ўстановы аб быццам бы іх прыналежнасці да камуністычнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ